*ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!*

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1987
10
снежня
чацвер
№ 34(1555)

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

## Беларускі універсітэт ТЭЛЕТАЙП
«УЧОРА · СЁННЯ · ЗАЎТРА»

### ШМАТ ПЫТАННЯЎ І ПРАБЛЕМ

па карэннаму паляпшэнню выкладання сацыяльна-эканамічных дысцыплін абмеркавалі ўдзельнікі рэспубліканскай навукова-метадычнай канферэнцыі, якая адбылася ў Інстытуце павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў грамадскіх навук пры БДУ імя У. І. Леніна. Тэма яе — «Актуальныя пытанні ўдасканалення выкладання грамадскіх навук і камуністычнага выхавання студэнтаў у святле патрабаванняў XXVII з'езда КПСС». Удзельнікі сустрэчы — выкладчыкі-грамадазнаўцы — выказалі слушныя заўвагі і прапановы па метадыцы вывучэння палажэнняў і выкладаў з'езда партыі. На канферэнцыі выпрацаваны практычныя рэкамендацыі па ўкараненню ў навучальны працэс новых прыёмаў, форм і метадаў выкладання.

З. АЛЯКСАНДРАВА.

### ПАСЯДЖЭННЕ САВЕТА

Белдзяржуніверсітэта адбылося нядаўна. На парадак дня былі вынесены пытанні аб стане навукова-тэхнічнай творчасці студэнтаў і меры па яго паляпшэнню (дакладчык У. Грузінскі); аб рэалізацыі загаду МінВНУ СССР па паляпшэнню падрыхтоўкі спецыялістаў па завочнай форме навучання (дакладчык — дэкан завочнага факультэта Г. Мацвееў). На савеце адбылося выбранне па конкурсу прафесарска-выкладчыцкага саставу і навуковых супрацоўнікаў універсітэта.

Д. ВІЛЬКІН.

### ЛЮДМІЛА ЧУРСІНА

— хто не ведае імя гэтай славутай артысткі тэатра і кіно? 15 снежня ў актавай зале БДУ ў 14.00 актрыса раскажа пра свой творчы шлях, пра планы і пра сябе, адкажа на пытанні сабраўшыхся. Білеты можна набыць у 302 пакоі галоўнага корпуса.

І. ВАЛАСЕВІЧ.

### СОРАК ГАДОЎ

спаўняецца народнаму тэатру пры універсітэце. На свой юбілей тэатр запрашае ўсіх жадаючых. У праграме вечара, які адбудзецца 17 снежня (пачатак ў 19.00), урачыстая частка і капуснік, падрыхтаваны ўдзельнікамі студыі. Уваход свабодны!

Ж. КРУГЛІКАВА.

## МЖК ДЗЕЙНІЧАЕ

# Пабудуем сабе дом

БОЛЬШ трох гадоў энтузіясты-камсамольцы горада Мінска даказвалі кіраўнікам розных узроўняў — ад гаркома камсамола да Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР — мэтазгоднасць і неабходнасць будаўніцтва маладзёжнага жыллёвага комплексу. І хто ведае, як бы склаўся лёс гэтай цудоўнай ідэі, калі б не выступленне на 39-й гарадской камсамольскай канферэнцыі Уладзіміра Старых, які абгрунтаваў, і вельмі аргументавана, даўно наспеўшую неабходнасць стварэння МЖК. Яго падтрымаў таварыш М. М. Слюнькоў — у той час першы сакратар ЦК КПБ. І работа зрушылася.

Пры гаркоме камсамола быў створаны аргкамітэт, які ўзяў на сябе ўвесь цяжар падрыхтоўчага перыяду.

Мінуў год. І вось ужо ў нашым універсітэце пры камітэце камсамола супрацоўнікаў і выкладчыкаў працуе і дзейнічае аргкамітэт МЖК. У яго састаў увайшлі: Ю. В. Пазняк (старшыня), І. Я. Андрушкевіч — прадстаўнік ад факультэта радыёфізікі і электронікі, А. М. Вештарт (ФПМ), П. І. Гайдук (НДІ ПФП), Л. Л. Мароз (біяфак), А. А. Самуйліч (намеснік сакратара камітэта камсамола БДУ), С. А. Язычэнка (фізфак).

З 21 кастрычніка 1987 года аргкамітэт БДУ пачаў прымаць заявы ад жадаючых удзельнічаць у спаборніцтве на права стаць байцом будаўнічага атрада МЖК. На 1 лістапада 1987 года ў нас налічвалася каля 100 заяў. На 1 снежня — больш 140. Наспела неабходнасць сабрацца ўсім разам і абмеркаваць хвалюючыя пытанні. Гэты дзень наступіў.

2 снежня адбыўся сход, на якім прысутнічала больш 70 чалавек. На жаль, не да ўсіх дайшла інфармацыя аб сходзе (што ён адбудзецца). Сказваецца старая хвароба: нежаданне чытаць аб'явы, чаканне паперы-джальнага званка ці паштовай карткі з запрашэннем, да чаго многія, відаць, прывыклі.

Для ўсіх, хто ўдзельнічаў у сходзе, былі выкладзены асноўныя палажэнні статута МЖК, а таксама праект «Асноўных прынцыпаў і парадку фарміравання маладзёжнага будаўнічага атрада (МБА) МЖК». Былі таксама дадзены адказы на многія пытанні. Адзначым, што пакуль невядома, ці можна ўдзельнічаць у спаборніцтве грамадзянам, якія маюць на аднаго чалавека болей 6 квадратных метраў жыллёвай плошчы. Гэта звязана з тым, што праект адпаведнай пастановы, распрацаваны аргкамітэтам МЖК г. Мінска, ужо каторы месяц вандруе з кабінета ў кабінет у гарадскім выканаўчым камітэце.

Аргкамітэт БДУ заклікае разгортваць спаборніцтва ўнутры падраздзяленняў. Вынікі будуць падводзіцца па наступных паказчыках: вытворчая. дзейнасць, грамадская работа, дзейнасць па арганізацыі МЖК.

Трэба памятаць, што кандыдат ў МБА на момант фарміравання атрада павінен мець стаж пастаяннай выканаўчай ці кіраўніцкай работы па арганізацыі МЖК не менш аднаго года (з праекта палажэння па МБА).

Аргкамітэт са свайго боку абавязуецца своечасова інфармаваць калектыў універсітэта аб рабоце па арганізацыі МЖК.

Дарэчы, стаць кандыдатам у МБА не позна і зараз. І яшчэ. Чытайце нашу газету! У ёй вы знойдзеце адказы на пытанні, якія вас цікавяць.

Ю. ПАЗНЯК,
асістэнт механіка-матэматычнага факультэта.

## Знаёмцеся: Андрэй Патрэбін



Студэнт IV курса факультэта журналістыкі, выдатнік вучобы, член савета універсітэта.

Фота С. ПЛЫТКЕВІЧА.

## НАВУКА — ВЫТВОРЧАСЦІ

# Вучоныя ў цэху

Раскажам пра новыя распрацоўкі НДІ ПФП БДУ імя У. І. Леніна.

РАБОЧЫ дзень старшага навуковага супрацоўніка НДІ прыкладных фізічных праблем БДУ імя У. І. Леніна Уладзіміра Іванавіча Кіслага пачынаецца не зусім звычайна. Таму што спяшаецца ён не да сябе ў лабараторыю, а ў адзін з цэхаў Мінскага вытворчага аб'яднання «Інтэграл». Побач звыкла займаюць месцы яго калегі — навуковы супрацоўнік Уладзімір Васільевіч Грыгор'еў і старшы інжынер Святлана Дзмітрыеўна Вяргейчык. Справу ведаюць яны дасканала, таму дзякуючы іх кансультацыям і аўтарскаму нагляду ўсе тэхналагічныя аперацыі выконваюцца дакладна, без памылак, што садзейнічае выпуску прадукцыі толькі высокай якасці.

На аб'яднанні ўжо не здзіўляюцца, што вучоныя, прапанаваўшы ім які-небудзь новы выраб, не толькі пастаўляюць яго на завод, але і самі непасрэдна ўдзельнічаюць у выпуску прадукцыі. Такое «сумяшчальніцтва», як паказвае практыка, выгадна абодвум бакам.

Інстытут развівае розныя формы супрацоўніцтва з прадпрыемствамі і арганізацыямі. Паспяхова выконваюцца, напрыклад, гаспадарчыя дагаворы з «Інтэгралам», БелОМА, дагаворы аб перадачы навукова-тэхнічных дасягненняў з «Гарызонтам», Мінскім метрапалітэнам, НВА «Дарбудтэхніка» і іншымі. Эканамічны эфект гэта дае немалы — 1,5—2 мільёны рублёў у год.

— Сфера дзейнасці нашага НДІ вельмі шырокая,— расказвае вучоны сакратар, кандыдат фізіка-матэматычных навук Уладзімір Іванавіч Папечыц.— Напрыклад, лабараторыя люмінесцэнцыі ўзяла на сябе пытанні, звязаныя з рашэннем праблем аховы навакольнага асяроддзя. У прыватнасці, тут распрацаваны прылады для вымярэння дымнасці газаў, якія знайшлі прымяненне ў аўтагаспадарках і вельмі неабходныя аўтамабілебудаўнікам БелаўтаМАЗа.

Добры кантакт з гэтым аб'яднаннем наладжан лабараторыяй лічбавага мадэліравання. Гэтак жа. як з гарадской санітарна-эпідэміялагічнай станцыяй — у плане апрацоўкі медыка-біялагічнай інфармацыі, з НДІ ЭВМ — па праграмнаму забеспячэнню новых персанальных электронна-вылічальных машын.

Супрацоўнікі лабараторыі спектраскапіі сумесна з Мінскім філіялам УНІПП вывучаюць магчымасці выкарыстання лазернага выпраменьвання для ўмацавання паверхняў дэталей падшыпнікаў.

Даследаванні Мінскага метрапалітэна праводзяць вібраакустыкі інстытута. Яны падрыхтавалі шэраг рэкамендацый, якія дапамогуць весці барацьбу з шумам і вібрацыяй, якія ўтвараюцца пры руху электрапаяздоў падземкі.

Свой уклад ва ўмацаванне сувязей навукі з вытворчасцю ўносіць і лабараторыя аўтаматызаваных навучальных сістэм. Здавалася б, камп'ютэрная тэхналогія навучання можа выкарыстоўвацца на поўную магутнасць толькі ў ВНУ. Але зараз ставіцца задача аб стварэнні вучэбных цэнтраў, падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы інжынерна-тэхнічных кадраў непасрэдна на прадпрыемствах, у галінах прамысловасці. Упэўнены, ад гэтага агульная справа толькі выйграе.

— З РЭШТЫ,— перарваў свой расказ Уладзімір Іванавіч,— пра тое, чым займаецца наша навука, вы можаце даведацца, як кажуць, з першых вуснаў.

...І вось мы гутарым з загадчыкам лабараторыі оптыкі кандэнсаваных асяроддзяў, кандыдатам фізіка-матэматычных навук Анатолем Антонавічам Мінько. Калектыў падтрымлівае цесныя сувязі з ВА «Інтэграл», Мінскім заводам «Электроніка», дзе выпускаюцца электронныя гадзіннікі і іншыя ўстройствы на вадкіх крышталах.

— Разнастайнасць іх у цяперашні час вялікая,— падкрэслівае Анатоль Антонавіч.— Аднак не ўсе яны адпавядаюць неабходным параметрам.

— Ці рэальна ліквідаваць гэты істотны недахоп?

— Безумоўна. Намаганнямі хімікаў і фізікаў нашай лабараторыі для электронных гадзіннікаў і персанальных камп'ютэраў створаны новыя патэнтаздольныя вадкакрышталічныя матэрыялы. Яны вызначаюцца вялікай хуткасцю рэакцыі на ўздзеянне электрычнага поля, забяспечваюць высокі кантраст адлюстравання. Праведзеныя выпрабаванні сведчаць аб тым, што гэтыя матэрыялы могуць паспяхова выкарыстоўвацца ў розных устройствах адлюстравання інфармацыі.

Хачу заўважыць, для тых, хто працуе ў НДІ, характэрна ўпэўненасць у вялікіх магчымасцях навукі. Яна абгрунтавана і пацвярджаецца справай.

У апошнія гады шмат увагі ўдзяляецца ахове навакольнага асяроддзя. Свой уклад у рашэнне гэтага важнага пытання ўносяць і члены калектыву, які ўзначальвае кандыдат тэхнічных навук, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР Данііл Аўрамавіч Ашкінадзе. Супрацоўнікам яго лабараторыі выдадзена каля 30 аўтарскіх пасведчанняў па рашэнню праблем экалогіі.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

# Вучоныя ў цэху

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

Вялікую цікавасць выклікае адна з апошніх распрацовак — лазерна-лакацыйная сістэма дыстанцыйнага кантролю аэразольнага забруджвання паветранага басейна горада. Радыус яе дзеяння — да дзесяці кіламетраў. Ужо заканчваецца стварэнне вопытных узораў.

У лабараторыі мне паказалі яшчэ адну навінку — фатометр. Узяўшы гэта арыгінальнае ўстройства на борт самалёта, лётчыкі сельскагаспадарчай авіяцыі змогуць хутка і дакладна ацаніць, у якім стане знаходзіцца той ці іншы ўчастак поля, даведацца, дзе пасевы маюць патрэбу ў дадатковай падкормцы, а ў якім месцы колькасць угнаенняў перавысіла норму. Асноўныя вартасці прылады, пра якую паклапаціліся вучоныя,— зручнасць у эксплуатацыі і нізкі кошт.

ПАТРЭБНА сказаць, цікавых задумак у калектыва НДІ ПФП нямала. І ўсё ж цяжка даць гарантыю, што кожная з іх будзе ажыццёўлена. То адзін, то другі мой субяседнік перапыняў расказ аб далейшым лёсе сваіх распрацовак агаворкамі тыпу «...калі зможам запусціць у серыю», «...калі Мінхімпром дасць згоду», «...калі МінВНУ СССР выдзеліць больш сродкаў» і г. д. Нярэдка яшчэ, на жаль, атрымліваецца так, што карысная вынаходства не можа прабіць сабе дарогу за парогам лабараторыі, дзе яно нарадзілася . І нават, трапіўшы за межы НДІ, не заўсёды знаходзіць сваю прапіску .

Напрыклад, лабараторыяй аптычных уласцівасцей паўправаднікоў створаны унікальны ёмісты спектрометр. Прылада незамянімая для тых, хто мае справу з мікраэлектронікай. Відавочна, распрацоўка знаходзіцца вышэй узроўню лепшых сусветных узораў. І ўсё ж пакуль яна не ўкаранёна ні на адным з прадпрыемстваў. Як тут не ўспомніць і пра каторы раз і пра злашчасныя ведамасныя бар еры, і пра нерастаропнасць, кансерватызм асобных кіраўнікоў. Правільна папракнуў нашых гаспадарнікаў малады інжынер інстытута Андрэй Борац: «Заказчыка часта шукаем мы самі».

Так, перад цяжкасцямі тут не спыняюцца, праяўляюць ініцыятыву, а ў некаторых выпадках і напорыстасць, дабіваючыся, каб распрацоўкі калектыву знаходзілі сваё выкарыстанне ў народнай гаспадарцы.

Зараз у НДІ вялікія надзеі ўскладваюць на будаўніцтва ўласнага канструктарскага бюро. Стварэнне яго, безумоўна, скароціць шлях ад нараджэння ідэі да ўкаранення яе ў вытворчасць.

А ў тым, што ў сценах інстытута будзе нараджацца новае і перадавое, можна не сумнявацца. У немалой ступені гэта прадвызначана тым, што навуковы патэнцыял інстытута пастаянна адчувае прыліў свежых сіл з БДУ імя У. І. Леніна. 150 студэнтаў універсітэта штогод праходзяць тут практыку, пішуць курсавыя і дыпломныя работы. Палова ўсіх тэм распрацоўваецца сумесна — лабараторыямі інстытута і універсітэцкімі кафедрамі. Эканамічны эфект дзевяць мільёнаў рублёў у год — сведчанне таго, што гэта супрацоўніцтва развіваецца плённа.

Нікога не патрэбна пераконваць у тым, што на сучасным этапе навукова-тэхнічны прагрэс стаў магутным паскаральнікам ва ўсіх сферах чалавечай дзейнасці. Але, думаецца, ёсць людзі, якія рухаюць уперад сам прагрэс. Калектыў Навукова-даследчага інстытута прыкладных фізічных праблем даказвае гэта на ўласным прыкладзе.

В. АЛЯШКЕВІЧ.

*МЫ — ІНТЭРНАЦЫЯНАЛІСТЫ*

# Герой свабоднай Нікарагуа

ХАЧУ РАСКАЗАЦЬ пра Карласа Фансека — героя свабоднай Нікарагуа, адроджанай 19 ліпеня 1979 года дзякуючы ўпартай барацьбе Сандзіністкага фронта нацыянальнага вызвалення (СФНВ).

У 1961 годзе Карлас Фансека разам са сваімі таварышамі Томасам Борхе, Херманам Памарэсам, Сільвіем Маёрга і іншымі стварылі партыю СФНВ, якая ў будучым павінна была стаць на чале народных мас і ўказаць ім шлях да перамогі.

Карлас Фансека нарадзіўся ў 1935 годзе ў горадзе Метагальпа, які цяпер з'яўляецца горадам-героем. Яго маці — простая і бедная жанчына, па прафесіі — кухар. Ёй выпаў цяжкі лёс. Яе муж — заўзяты самосавец — кінуў жонку з маленькім дзіцем на руках.

Карлас вучыцца ў школе на выдатна. З 19 гадоў — ва універсітэце, на юрыдычным факультэце, але хутка стаў займацца ў палітычным гуртку, які кіраваўся марксісцка-ленінскай філасофіяй. За ўдзел у гуртку Карласа выключаюць з універсітэта.

У 1951 годзе ён пабываў у Маскве на VI Фестывалі моладзі і студэнтаў. Пасля гэтай паездкі напісаў «Адзін нікарагуанец у Маскве». Паездка ў Маскву скончылася для яго астрожнай камерай. У агульнай складанасці Карлас трапляў у турму 5 разоў.

У 1932 годзе Сандзіна пісаў:

«Мы ведалі, што прадажныя пісакі спрабуюць абняславіць нас, называючы бандытамі. Сапраўдныя бандыты хаваюцца ў пячорах Белага дома ў Вашынгтоне. Адтуль яны кіруюць грабяжамі і забойствамі ў нашай Амерыцы; пакуль у Нікарагуа ёсць сыны, якія яе любяць, яна будзе свабоднай».

Восьмага лістапада 1976 года Карласа Фансека забілі гвардзейцы Самосы. Але ён заўсёды будзе жыць у нашых сэрцах. Мы памятаем яго не толькі як таварыша, але і як настаўніка, як лепшага байца нашай партыі. І сёння нікарагуанскі народ гаворыць: «Карлас, ты заўсёды з намі. No pasaran! Свабодная смерць або жыццё!»

ХУАН САНЧАС,
студэнт гістарычнага факультэта.

# ДЗЕ ЗНАЙСЦІ ЦІШЫНЮ




Цішыня... Тут заўсёды цішыня асаблівая, не падобная на ўсе астатнія. Толькі адчыняеш дзверы — і яна авалодвае гэтак жа, як водар чыстага вясковага паветра ў сасновым бары. Там непаўторны лясны каларыт стварае задорны, вясельны спеў птушак; тут — ціхае, працавітае рыпенне ручак на паперы, шоргат перагортваемых старонак. Там — пяецца гімн вясне, шчасцю; тут — ведам, навуцы. Адчыняеш дзверы і агортваешся гэтай ціхай, працавітай атмасферай, дзе кожны сустракаецца з нечым незнаёмым, невядомым.

Вучэбна-метадычны кабінет сацыяльна-эканамічных і гістарычных навук... Многія студэнты наведваюць яго кожны дзень, рыхтуюцца да семінараў, пішуць рэфераты, даклады, бо кабінет — самае падыходзячае для гэтага месца: заўсёды павышаецца жаданне працаваць, ніхто табе не перашкаджае і ёсць уся неабходная літаратура. Вось і НА ЗДЫМКУ: рыхтуюць патрэбную літаратуру біблятэкары А. В. Круцько і К. І. Афоніна.

Кабінет — твой памочнік, студэнт! Знаходзіцца ён на шостым паверсе галоўнага корпуса універсітэта ў пакоі № 604. Заходзьце, калі ласка!

Фота С. ПЛЫТКЕВІЧА.

*Sos! Sos! Sos!*

# Каму ён патрэбен, гэты тэатр?

ТЭАТР... Ці не гучная гэта назва для невялікага (на сённяшні дзень па прычынах, аб якіх прыходзіцца гаварыць з болем) калектыву студэнтаў, аб'яднаных жаданнем служыць мастацтву? Магчыма, не. Таму што ў калектыва тэатра БДУ ёсць не толькі жаданне працаваць, а і патрэба выносіць сваю работу на суд гледача. Сапраўды, што такое тэатр без гледача? А калі паўстае пытанне-праблема: куды яго весці — у інтэрнат, падвал, а можа у пад'езд? Бо пра спецыяльна абсталяваную залу нам марыць нават не прыходзіцца.

Чаму?

Пяць гадоў назад у студэнцкі тэатр прыйшоў новы мастацкі кіраўнік Барыс Пятровіч Втораў. Сезон адкрылі вадэвілем У. Салагуба «Бяда ад пяшчотнага сэрца». Потым былі «Юбілей» А. Чэхава, «А світанкі тут ціхія...» Б. Васільева, «Развітанне ў чэрвені» А. Вампілава. Як бачыце, калектыў напружана працаваў і з аддачай. Аднак наша бяда была большая за бяду героя У. Салагуба — мы не мелі свайго памяшкання. І кожны сезон пачынаўся для нас з пошукаў якога-небудзь кутка. То мы займаліся ў старым фізічным корпусе (зараз ён на рамонце), то ў зале Інстытута народнай гаспадаркі (на правах кватаранта, дзе па першаму грознаму крыку вахцёра павінны былі перапыняць рэпетыцыі), то ў інтэрнаце № 2, дзе пакідалі свае дакументы на вахце і артысты, і нашы гледачы, дзе нам перашкаджалі і грукат за дзвярыма, і многае іншае. Ды і ад нас, безумоўна, нашы суседзі па блоку не мелі адпаведнага спакою, бо рэпетыцыі ёсць рэпетыцыі. Яшчэ дзякуй камендантам, што далі прытулак хоць на абмежаваны час.

Цікава, што аб становішчы тэатра ведаюць амаль усе: і рэктарат, і партыйны камітэт, і камітэт камсамола універсітэта...

Новы сезон мы зноў адкрылі без надзеі на перамены, а тэатру, між іншым, у гэтым годзе спаўняецца 40 гадоў! Самадзейныя артысты страцілі веру ў тое, што можа што-небудзь змяніцца. Бо не змаглі нам дапамагчы вырашыць праблему з памяшканнем:

— камітэт камсамола і прафком студэнтаў універсітэта;

— перагаворы двух рэктараў: БДУ і наргаса;

— МінВНУ з парадай дзяліць залу на дваіх;

— Беларускае радыё з інфармацыяй аб крытычным становішчы тэатра;

— Міжсаюзны дом мастацкай самадзейнай творчасці;

— аддзел культуры выканкома Маскоўскага раёна.

Працягнуў руку дапамогі другі сакратар Маскоўскага райкома камсамола Л. Панчанка. Прапануемая ім памяшканне знаходзіцца на Паўднёвым Захадзе, але гэта ўжо не тэатр БДУ.

Дык хто зможа дапамагчы студэнцкаму тэатру БДУ, які, нягледзячы на свой салідны саракагадовы ўзрост, нібы малое дзіця без ніводнай нянькі. Няўжо ён нікому не патрэбны?

А. ВАСІЛЕЎСКАЯ,
студэнтка філфака,
член савета тэатра.

*З НАШАЙ ПОШТЫ*

# Вучыцца вучыць

Амаль месяц студэнты IV курса філалагічнага факультэта праходзілі практыку ў школах горада Мінска.

Для мяне гэта была першая педагагічная практыка. Што яна мне дала і што я зрабіў карыснага для школы?

Па-першае, нам неабходна было навучыцца весці сябе ў класе. Вельмі цяжка спачатку знайсці агульную мову з вучнямі. Успомнілася мне нечаканая сітуацыя. Вяду урок рускай літаратуры ў восьмым класе. Захапіўшыся, раптоўна чапляюся нагой за дыпламат, ён з грукатам падае на падлогу. Клас яхідна маўчыць: што я буду рабіць далей — падыму дыпламат альбо зраблю выгляд, што нічога не адбылося? Сітуацыя...

Вялікую ўвагу трэба студэнтам звяртаць у аваладанні правільнай жэстыкуляцыяй. На ўваходзячага ў клас студэнта-практыканта нацэлены дзесяткі вачэй, якія заўважаюць нават адарваны гузік, ужо не гаворачы пра міжвольныя рухі. Правільным рухам і мімікі таксама неабходна вучыцца.

Практыка ў школе для нас дала не толькі пачатковую прафесійную падрыхтоўку, але і дапамагла ў набыцці жыццёвага вопыту. Мы сталі больш сталымі, змаглі па-сапраўднаму выкарыстаць плён настаўніцкай працы — такой цяжкай і такой высакароднай.

В. НАВУМЕНКА,
студэнт філалагічнага факультэта.

*НЯМА АГНЮ БЕЗ ПРЫЧЫНЫ*

# Пільнаваць чырвонага пеўня

ШМАТ ужо сказана аб праблемах пажараў — зле, якое знішчае народныя грошы і забірае жыцці людзей. Але не мінае і дня, каб не ўскалыхнулі рытм і спакой нашага горада трывожныя сігналы пажарных, што спяшаюцца на дапамогу да тых, хто трапіў у бяду.

Прычыны ўзнікнення пажараў у большасці выпадкаў, як гэта ні горка, да банальнасці простыя — легкадумнасць і нядбайнасць людзей. І самае жудаснае, што многія віноўнікі пажараў расплачваюцца за сваю бестурботнасць жыццём.

Вось толькі адзін факт сумнай статыстыкі. Дзякуючы дакладным і рашучым дзеянням пажарнікаў падраздзяленняў удалося выратаваць больш ста чалавек і будынак ад агню, які ўзнік ад ўключанага і пакінутага без дагляду электраабагравальніка ў адным з пакояў інтэрната № 1 БДУ па вуліцы Свярдлова.

Чырвоны певень не даруе і тым, хто грэбуе правіламі пажарнай бяспекі, ігнаруе прадпісанні пажарнай аховы. У першую чаргу гэта датычыць кіраўнікоў, бо ад іх арганізацыйных і кантралюючых дзеянняў у многім залежыць быць ці не быць пажару. Так, пры пажарна-тэхнічным абследаванні БДУ імя У. І. Леніна быў выяўлены рад парушэнняў, якія і да цяперашняга часу не ліквідаваны пасля неаднаразовых прадпісанняў Дзяржпажнагляду. Напрыклад: памяшканні інфармацыйна-вылічальнага цэнтра не абсталяваны аўтаматычнымі ўстаноўкамі газавага пажаратушэння; у інтэрнатах, у хімічным і біялагічным вучэбных карпусах дзверы на лесвічных пляцоўках, у ліфтавых холах і перагародках, якія размяжоўваюць калідоры на адсекі, не абсталяваны прыладамі для самазакрыцця з ушчыльненнем у стыках і шкленнем з арміраванага шкла, што садзейнічае хуткаму распаўсюджванню дыму па паверхах у выпадку пажару. На складзе фізічнага факультэта захоўванне матэрыялаў ажыццяўляецца не па прынцыпу аднароднасці. Дапускаецца мантаж часовай электраправодкі, захоўванне матэрыялаў на шляхах эвакуацыі.

У. ЦЯРЭШКА.

**ПРЭМ'ЕРА РУБРЫКІ**

Сённяшняй раніцай, як заўсёды, спяшаўся ты на занятկі. Мільгалі адна за адной станцыі метро, хваляваўся натоўп пасажыраў. Але непакоіла цябе зараз толькі тое, што хавалася за двума словамі: канфліктная сітуацыя. Гэта значыць у тваю групу — твой дом — завітала бяда. Нязвыкла ціхімі і доўгімі зрабіла яна перапынкі, не дазваляе шчыра ўсміхнуцца суседу і проста зазірнуць у вочы адзін аднаму. Як быць? Дзе шукаць паратунку? На першым курсе амаль ніхто нічога не ведае, на другім — здагадваюцца, на трэцім — ужо могуць нешта параіць.

Таму новая рубрыка газеты «Я. Ты. Наша група» бачыцца нам як скарбонка вопыту, сабранага з жыцця розных груп. Спадзяемся, што яе публікацыі зацікавяць цябе, чытач.

Першы расказ аб групе, дзе выключнасць кожнага ніколькі не перашкаджае агульнай справе і сяброўству, вядуць студэнты трэцяга курса аддзялення гісторыі КПСС гістарычнага факультэта і карэспандэнт М. ЗАГОРСКАЯ.

**Я. ТЫ. НАША ГРУПА**

# Калі выключнасць не перашкаджае



Апошняй атэстоўвалі Юлю Шэлегаву. Пытанне загадчыка студэнцкага аддзела ЦК ЛКСМБ А. Данілава прагучала для групы нечакана:

— Ці была Юля сапраўдным лідэрам?

Толькі што, не шкадуючы сіл і слоў, спрачаліся, даказвалі, абвінавачвалі, апраўдвалі і раптам — замаўчалі. Цяжка адразу вызначыць тую мяжу, што адрознівае сапраўднага лідэра ад лідэра па волі абставін.

Адзін знаёмы школьнік, сакратар камітэта камсамола вырашаў пытанне проста:

— Лідэр — гэта камеьчык, а ўся астатняя маса — мяккі пластылін. Каб яны звыкліся з існаваннем суседа, павінен прайсці нейкі час. У сапраўднага лідэра атрымаецца ператварыць масу ў цвёрды маналіт.

Для групы ўсё выглядае значна складаней і не так адназначна. Першым камсоргам была Энэбай Какабаева. Чалавек актыўны, прынцыповы. На кожнае пытанне мела свой пункт гледжання. Таму многія, у тым ліку і Марына Міхайлава, лічаць, што такі чалавек і можа карыстацца аўтарытэтам.

— Юля мякчэй, Энэбай напорысцей. Гэта іх чалавечыя якасці,— не згаджаецца Вольга Прыгодзіч.— Але справе гэта не перашкаджае.

— І ўсё-такі хто ў групе лідэр?

**У. Сяркоў.** Мабыць, усе. Кожны да гэтага імкнецца.

**М. Марчанка.** У мінулым мы ўсе былі лідэрамі. У школе або на прадпрыемстве. Таму захавалася звычка камандаваць.

**С. Аліева.** Так атрымоўваецца. Толькі хіба гэта вельмі дрэнна?

— Гэта групе жыць, сябраваць не перашкаджае?

— Ужо не.

Але ж былі моманты, калі пытанне аб лідэрстве не дазваляла вострав угольным каменьчыкам самалюбства прыцерціся адзін да аднаго. Былі. А якая вузаўская група можа адмаўляць, што на першым курсе іменна гэта не дазваляе многім разглядзець сябroў сярод аднакурснікаў? Сустракаюцца людзі ўпэўненыя ў сваёй выключнасці. Вельмі цяжка кожнаму на першым часе пагадзіцца, што нічым асаблівым сярод іншых ён не вылучаецца. Што атрымоўваецца часам? Зняважлівыя позіркі, недарэчныя крыўды, нежаданне падпарадкоўвацца. Для трэцяга курса аддзялення гісторыі КПСС гэты перыяд ужо прайшоў. І вынікі атрымаліся нечаканыя. Адказ на пытанне: «Хто такі лідэр? Чалавек, якому без слоў падпарадкоўваюцца? Той, каго паважаюць? Або баяцца?» пры дапамозе Светы Адашовай быў знойдзены:

— Чалавек, які здольны павесці за сабой астатніх. Аўтарытэтны ва ўсіх адносінах. Душа групы.

А агульнае меркаванне пасля спрэчак і размоў гучала такім чынам: «У нас у групе лідэра няма».

Здавалася б, ім павінна стаць камсамольскае бюро групы. Толькі на грамадска-палітычнай атэстацыі група аднадушна адмовілася ад стварэння груваcткага, на яе думку, апарату кіравання.

**М. Міхайлава.** Калі б знік падзел камсамольскай работы на сектары, калі б мы не атрымлівалі ўказанняў «зверху». Калі б адмяніць усю гэтую нашу так званую «ра-бо-ту». Разумееце? Ніхто б не стаў яе шкадаваць. І не пабег бы скардзіцца ў камітэт камсамола універсітэта. Яна проста нікому не патрэбна! У чым яе перавага над работай без сектараў? Хіба толькі ў стосе розных непатрэбных папер. Што нам прапануюць у пачатку года? Давайце складзем планы. Што патрабуюць у канцы? Справаздачы.

**Э. Какабаева.** Усе нашы справы — гэта не ажыццяўленне задумы аднаго лідэра ці камсамольскага бюро. Не такая ўжо вялікая ў нас група, каб вылучаць эліту для вырашэння галоўных напрамкаў работы. Дні імянінніка, вечары нацыянальнай дружбы, прапанова Эдзіка Цімчука ўдзельнічаць у рэстаўрацыі Троіцкага прадмесця. Усё гэта ішло ад жадання кожнага. Хацеў чалавек працаваць на суботніку — ішоў і працаваў. Без ніякіх пастаноў.

**С. Аліева.** Калі ніхто не прымушае, калі арганізоўваецца ўсё не для справаздачы, тады справа не будзе доўгі час стаяць на месцы. Нашто тыя мерапрыемствы, якія нас не цікавяць?

Шмат слоў абурэння было выказана ў адрас непатрэбных мерапрыемстваў, непатрэбных даручэнняў. І ўспомнілася, як у час атэстацыі выступала адказная за акадэмічны сектар Марына Міхайлава.

— Мы працавалі ўвесь год паралельна: я і староста групы. След у след стваралі спіскі адсутнічаючых і неспяваючых. Калі аб нечым мог забыцца староста, у яго была для напамінку адказная за акадэмработу Маша. І наадварот. Я доўгі час не магла вызначыць, хто я такая: надзіральнік ці прыправа да старасты? Атрымлівалася: староста працуе для дэканата. Адказнага за акадэмсектар трымаюць для акадэмічнай камісіі.

Здаецца, агульным камсамольскім сходам групы было вырашана гэтае пытанне. Марыну вызвалілі ад абавязкаў дублёра старасты. Але прайшоў час, і з'явілася новая пастанова, па якой выходзіць: без пятага кола ў рабоце старасты не абысціся. Як нельга было калісьці наладжваць і сувязь паміж камітэтам камсамола факультэта і групамі аддзялення без пасрэдніка — бюро аддзялення?

**Э. Какабаева.** У яго склад уваходзіла пяць чалавек. Чым займаліся астатнія? На маю думку, працавалі «хвастамі». Я ж выконвала пачэсную ролю дзяўчынкі на пабягушках. «Звязвала» Сяргея Літвінчыка і камсоргаў чатырох груп аддзялення. Вось гэта і былі мае абавязкі. А дзе канкрэтная работа?

Што такое канкрэтнасць у выкананні той ці іншай справы, тут добра ведаюць. І кажуць так не дзеля прыгожага выразу. Аднойчы, здаецца, прапанавала гэта сама Энэбай, калі вучыліся яны яшчэ на першым курсе. Вырашыла група знайсці для сябе агульную камсамольскую справу, каб аб'яднацца самім і прынесці каму-небудзь карысць. Аб'ектам клопату абралі школу-інтэрнат № 5. Ведалі: там іх дапамога сапраўды патрэбна. Не пужала і тое, што знаходзіцца школа далёка, што ў кожнага ёсць не адно грамадскае даручэнне. Дапамаглі правесці канцэрт, арганізаваць вечар, камсамольскі сход, падрыхтавалі некалькі лекцый. Вольга Каламіец, дазнаўшыся пра тое, што многія з падшэфных жадаюць займацца аэробікай, сама прапанавала праводзіць заняткі. Ездзіць прыходзілася па два разы на тыдзень. Але больш перашкаджаў не недахоп часу, хоць не так і лёгка студэнту выкраіць «лішнюю» хвіліну, а ўзнікшыя цяжкасці з набыццём спартыўнай формы і залы для заняткаў. У Светы Адашовай, адказнай за шэфскую работу, свае клопаты: трэба дапамагчы арганізаваць работу школьнага камітэта камсамола. Паспрабавала, але хіба ж атрымаецца лепей, чым у работнікаў райкома, якія кожны тыдзень праводзяць вучобу камсамольскага актыву?

Да таго ж, часам атрымлівалася, што шэфы са сваімі прапановамі зусім недарэчна «укліньваліся» у план мерапрыемстваў, распрацаваны педагагічным калектывам.

Праз два семестры гэта зразумелі, але ад дапамогі не адмовіліся. І зараз, канешне, не без удзелу іншых груп сабралі кнігі для школьнай бібліятэкі. Разлічваюць правесці суботнік і заробленыя грошы таксама пералічыць у фонд інтэрната.

І зноў нагадваем час, калі дзейнасць групы толькі пачалася. Якой хацелі бачыць яны сваю камсамольскую арганізацыю і што з гэтага атрымалася?

**Т. Марозава.** Я была сакратаром камітэта камсамола на прадпрыемстве. Не буду ўпрыгожваць. Даводзілася нялёгка. І безыніцыятыўныя камсамольцы былі, і часу не хапала. А студэнцкую моладзь уяўляла сабе зусім іншай. Энергічнай, па-сапраўднаму перадавой... У першыя ж месяцы вучобы расчаравалася.

**С. Аліева.** Асноўная наша бяда ў тым, што мы лічым: камсамольцы павінны быць такія, такія і такія... Мы забываем, што яны звычайныя людзі. З недахопамі і ўласнымі, зусім не схематычнымі поглядамі на жыццё. Ёсць вельмі шчырыя людзі, але не з тых, што ўмеюць лезці ў вочы начальству, камандаваць і весці за сабой. Толькі справу сваю яны выконваюць, як кажа душа.

**Г. Марозава.** Ты кажаш аб душы. А ў іншага гэтая самая душа нічога не жадае. Ні ў тэатр ісці, ні вучыцца, ні працаваць...

**Г. Кавалеўскі.** Праблем у камсамола, самі разумееце, яшчэ шмат. Мы крытыкуем, а хто-небудзь прапанаваў як-небудзь змяніць формы работы? Чаму не? У сілу звычкі.

Група хоць і з'яўляецца ўжо сама па сабе калектывам, але не можа існаваць адасоблена. Чым жыве камітэт камсамола універсітэта? Выказванні пачуліся адразу, як толькі прагучала пытанне:

— Мы нават не ведаем усіх яго членаў.

— Там, дарэчы, дзверы не зачыняюцца. Зайшлі б і пазнаёміліся.

— А можа лягчэй зазірнуць у групу аднаму чалавеку. чым усім па чарзе ў камітэт камсамола?

**Г. Кавалеўскі.** Часам сувязь адсутнічае не па віне некага там «наверсе». У групах самі імкнуцца да разрыву. Якім чынам?

Фармальным падыходам да выбараў камсорга. Прапануюць: будзеш ты! У адказ: чаму я? Тады — ты. Не жадаю. Зрэшты, знаходзяць-такі крайняга. У выніку камсоргаў як быццам і няма. Іх знайсці нельга. Адсюль — і сувязі ніякай. Мне, напрыклад, імпануе ідэя аб наказах, складзеных для кожнага з членаў камітэта камсамола тымі, хто іх выбіраў. Там будзе ўсё тое, што патрэбна факультэту, групе. А праз 3—4 месяцы надыдзе і тэрмін справаздачы. Тады не ў паперкі глядзець будуць актывісты, а ў вочы камсамольцаў.

**Т. Марозава.** А памятаеце, як удзельнічалі мы ў выбарах у камітэт камсамола, калі былі на першым курсе? Нашто нам спісы? Давайце вылучаць адкрыта жывых людзей і галасаваць.

**М. Марчанка.** Павінна быць перадвыбарная барацьба. Выходзіць чалавек і прапануе сваю праграму дзейнасці. І тым, хто сядзіць у зале, вырашаць, хто будзе працаваць у камітэце.

Тут няма строгіх графікаў правядзення камсамольскіх сходаў (а такія, расказваюць, яшчэ вісяць у камітэтах камсамола многіх факультэтаў спецыяльна для таго, каб інфармаваць правяраючых) проста, як толькі адчуваецца патрэба ў размове аб набалелым — група застаецца добраахвотна.

Тут не заўсёды выказваюць адзін аднаму толькі добрыя словы. Часцей за ўсё атрымліваецца наадварот: усе разам разбіраюць самы нязначны праступак і пакаранне выносяць заўсёды строгае.

І калі ўжо група вырашыла, ніхто не зможа прымусіць іх, «несфарміраваўшыхся максімалістаў», як лічылі раней старшакурснікі, ад рашэння адмовіцца.

Можа таму і няма тут людзей незадаволеных і безыніцыятыўных?

# Хутчэй! Вышэй! Дужэй!



## РЭПАРТАЖ У НУМАР

# АЭРОБІКА: спорт ці мастацтва?

Што такое аэробіка? На гэта пытанне адкажа, напэўна, кожны. Гэта — спорт і музыка, добры настрой і прыемны адпачынак, а яшчэ — цудоўны выгляд. Наш пазаштатны карэспандэнт звярнуўся да майстра спорту па мастацкай гімнастыцы, студэнткі хімічнага факультэта Таццяны СУХАНАВАЙ. Таццяна кіруе групай аэробікі ў БДУ.

— Па сведчаннях прэсы, папулярнасць аэробікі зніжаецца. А якая цікавасць да яе ў нас?

— У мінулым годзе існавалі ў БДУ тры групы. Сёлета — ужо шэсць. Тым не менш колькасць жадаючых, здаецца, павялічваецца.

— Ці патрэбна аэробіка студэнтам?

— Лічу, што так. Але лепш за ўсё паспрабаваць самому, тады і зразумець гэта будзе лягчэй.

Апранаюся ў спартыўны касцюм і накіроўваюся ў спартыўную залу стадыёна «Дынама». Заняткі яшчэ не пачаліся. Таццяна перамотвае магнітафонныя стужкі.

— Музыку і рухі падбіраю сама. Пачую добрую мелодыю — паспрабую перад люстрай рухі. Калі атрымліваецца нядрэнна — уключаю ў праграму нашых заняткаў. Вось толькі з музычнай апаратурай не ўсё ладзіцца: магнітафон «Электроніка» па тэхнічных характарыстыках не зусім зручны для нас.

Хто ж прыходзіць на заняткі да Таццяны? Кантынгент групы неаднародны: ад студэнта да выкладчыка. Уражанні Карыны Насівенц і Святланы Клімянковай амаль супадаюць, хаця наведваюць гэтую групу яны толькі другі раз.

— Вельмі падабаецца! Па-першае, адпачываеш ад вучобы, па-другое, сочыш за здароўем, а галоўнае, з якім бы дрэнным настроем ты ні прыйшоў, дадому пойдзеш вясёлы і задаволены.

Людміла Пятроўна Кудрына, выкладчыца педвучылішча № 2 дадае:

— Наведваю групу другі год. Можа каму і здаецца, што гэта залішне, але я ўпэўнена: ні ўзрост, ні сям'я не павінны перашкаджаць спартыўным заняткам. Я і адчуваць пачала сябе лепей, і хварэю менш, палепшыліся настрой і працаздольнасць.

...Загучала музыка. Усе занялі свае месцы, перад люстрай стала і я. Дынамічная кампазіцыя змянялася павольнай, разнастайныя рухі і пластычнасць Таццяны запалілі мяне. На імгненне я азірнулася і ўбачыла, што пад такім жа ўражаннем знаходзяцца і астатнія.

Час прамільгнуў хутка. Таццяна зрабіла апошнія рухі і прыемна развіталася з групай. Стомленасць, якую я адчувала напярэдадні, — зняло, нібы рукой.

— Такое бывае кожны раз пасля трэніроўкі, а ў мяне яны — кожны дзень. Я не магу ўявіць без гэтага свайго жыцця.

Так кажа кіраўнік. Хутка так будуць казаць усе тыя, хто па-сапраўднаму зацікавіцца аэробікай. Спортам? Мастацтвам?

Н. ФЛАРЫЗЯК.
студэнтка факультэта журналістыкі.

## ПАДВЯДЗЕМ ВЫНІКІ

# Пераможцамі сталі

У канцы лістапада гэтага года адбылася XVII справаздачна-выбарная канферэнцыя спартыўнага клуба Белдзяржуніверсітэта. На ёй былі падведзены вынікі агляду-конкурсу па спартыўна-масавай рабоце і XXXV спартакіяды універсітэта 1987/88 навучальнага года. Са справаздачным дакладам выступіў старшыня спартыўнага клуба БДУ А. С. Балдзін.

ПЕРАМОЖЦАМІ Ў АГЛЯДЗЕ-КОНКУРСЕ ЗА 1987 ГОД СТАЛІ:

**І месца** — юрыдычны факультэт (узнагароджаны пераходным Чырвоным сцягам і Граматай рэктарата);

**ІІ месца** — фізічны факультэт (узнагароджаны вымпелам і Граматай рэктарата);

**ІІІ месца** — факультэт радыёфізікі і электронікі (узнагароджаны вымпелам і Граматай рэктарата).

ПА РЭЗУЛЬТАТАХ СПАРТАКІЯДЫ:

**І месца** — фізфак;

**ІІ месца** — ФПМ;

**ІІІ месца** — юрыдычны факультэт.

У СПАРТАКІЯДЗЕ ЗДАРОЎЯ ЛЕПШУЮ ФОРМУ ПАДРЫХТОЎКІ ПАКАЗАЛІ:

**І месца** — фізічны факультэт;

**ІІ месца** — факультэт радыёфізікі і электронікі;

**ІІІ месца** — вылічальны цэнтр.

ПА АСОБНЫХ ВІДАХ СПОРТУ ВЫЗНАЧЫЛІСЯ:

**юрыдычны факультэт:** гіры, дзюдо, класічная барацьба, лёгкая і цяжкая атлетыка;

**фізічны факультэт:** валейбол, асенні крос, мініфутбол, шахматы, ваенна-прыкладное мнагаборства;

**ФПМ:** баскетбол, валейбол (жанчыны), крос, лёгкая атлетыка;

**факультэт радыёфізікі і электронікі:** плаванне.

**гістарычны факультэт:** лыжныя гонкі;

**геаграфічны:** спартыўнае арыентаванне;

**хімічны:** кулявая стральба;

**біялагічны:** настольны тэніс і кулявая стральба.

А. БАСАНАЎ.

## СА СТУЖКІ ТЭЛЕТАЙПА

У НІЦЫ (Францыя) завяршыўся 13 мемарыял французскага атлета АНРЫ ДЭГЛАНА. У ім выступала група савецкіх спартсменаў. Сярод пераможцаў у класічнай барацьбе весам да 68 кг КАМАНДАР МАДЖЫДАЎ, студэнт V курса юрыдычнага факультэта.



## ІНТЭРВ'Ю ПАСЛЯ ГУЛЬНІ

Свісток суддзі падвёў апошнюю рысу ў гульні па валейболу паміж жаночымі камандамі БДУ і Мінскай дзіцяча-юнацкай спартыўнай школы. Лік 3:0. Перамога ў нашай каманды. Трэнер зборнай універсітэта па валейболу М. М. Кучынскі, безумоўна, застаўся задаволены такім пачаткам спаборніцтва.

# лёгкага мяча!

— ТАКІЯ спаборніцтвы праводзяцца ўпершыню і атрымалі назву — першынство абласнога савета прафсаюзаў. У ім прымаюць удзел 12 мацнейшых вытворчых каманд і каманд ВНУ вобласці. Гульні, якія пачаліся пятага снежня, закончацца ў канцы студзеня.

— *Склалася ўражанне, што гэта перамога далася нашым дзяўчатам вельмі легка.*

— Супраць іх гуляў лепшы састаў валейбалістак ДЮСШ, але яны яшчэ вельмі юныя — 8—9 клас. Наперадзе нас чакаюць сустрэчы больш сур'ёзныя, з вопытнымі камандамі. І тут нельга не ўлічваць, што наш калектыў, хоць і заняў у лістападзе ІІІ месца ў чэмпіянаце горада па валейболу, прапусціўшы наперад толькі каманды інстытута фізкультуры і гарана, за апошнія месяцы абнавіўся на 50 працэнтаў. Наша задача зараз — найграць састаў, навічкам набрацца вопыту. Да таго ж гэтыя спаборніцтвы — адзін з этапаў падрыхтоўкі каманды да студэнцкай спартакіяды рэспублікі, якая адбудзецца ў маі 1988 года. У гэтай гульні добра сябе паказалі Марына Шчарбакова (ІІІ курс, журфак), Валерыя Ліпковіч (ІІ курс, хімфак).

— *А як справы ў мужчын, якія спаборніцтвы ў бліжэйшым будучым чакаюць іх?*

— Мужчынская зборная універсітэта па валейболу зараз таксама знаходзіцца ў стадыі абнаўлення. У канцы студзеня наступнага года адбудуцца спаборніцтвы па валейболу на кубак Дружбы, у якіх прымуць удзел жаночыя і мужчынскія каманды прыбалтыйскіх універсітэтаў і БДУ. Такія спаборніцтвы сталі ўжо традыцыйнымі, і ў наступным годзе споўніцца 20 гадоў, як яны праводзяцца. Пройдуць яны ў Тарту.

— *Давайце вернемся да цяперашніх спаборніцтваў. Які каляндар у іх?*

— Яны будуць праходзіць па серадах і суботах. Наступная гульня з камандай радыётэхнічнага інстытута. 12 снежня і ў астатнія суботы да канца студзеня спаборніцтвы будуць праходзіць у спартыўнай зале БДУ, пачатак у 18.30.

Інтэрв'ю правёў
А. МАКСІМАЎ.

## НА СТАРТ, ПЕРШАКУРСНІК!

# Крос: лічбы і думкі

**У ПОШУКАХ** адказнага за праведзены крос-87 сярод студэнтаў першых курсаў БДУ я наведаў спартыўную пляцоўку стадыёна «Дынама». Там якраз ішлі заняткі па фізічнай культуры. На дыстанцыі бегалі і разміналіся юнакі, дзяўчаты абступілі выкладчыка, які расказваў ім пра нарматывы. Вось так бы заўсёды: займацца фізічнай культурай і спортам з задавальненнем і без праблем...

Размаўляю з адказнай за крос-87 сярод першакурснікаў, трэнерам па лёгкай атлетыцы Валянцінай Васільеўнай Зарэцкай. Даведваюся, што ў кросе прынялі ўдзел 1680 чалавек, прысутнічалі першакурснікі ўсіх факультэтаў, гэта значыць 75 вучэбных груп. Вынікі такія:

І месца — мехмат;
ІІ — хімфак;
ІІІ — ФПМ.

Астатнія месцы размеркаваліся аднаведна такім чынам: юрфак, журфак, фізфак, геафак, біяфак, філфак, факультэт радыёфізікі і электронікі, гістфак.

Па выніках вучэбных груп:
І месца — IV група хімфака;
ІІ — ІІ група журфака;
ІІІ — І група мехмата.

Безумоўна, я патрыёт свайго факультэта, і таму не магу не парадавацца за сваіх сакурснікаў. Пры пятым месцы сярод курсаў другая група выйшла на ІІ месца сярод груп.

А хто самы хуткі сярод першакурснікаў? У забегу на 1000 метраў у юнакоў:

1. Ігар Сіняк (юрфак).
2. Сяргей Багдан (юрфак).
3. Аляксандр Балаш (біяфак).

На дыстанцыі 500 метраў у дзяўчат:

1. Вольга Маслоўская (юрфак).
2. Вольга Іваненка (ФПМ).
3. Святлана Федаркевіч (геафак).

**ГАВОРАЧЫ** аб кросе-87, хочацца яго, зразумела, параўнаць з кросамі папярэдніх гадоў. І як гэта ні крыўдна, але не вельмі выдатную спартыўную форму прадэманстравалі сёлета першакурснікі. Мяркуйце самі. Рэкорды адсутнічалі, але не гэта самае дзіўнае. Толькі а д з і н к і ўклаліся ў нарматывы!

З нейкай напружанасцю паведамляла мне гэта Валянціна Васільеўна. Што такое? Адказ яе быў шчыры:

— Штогод да нас прыходзяць пісаць пра крос. Штогод мы бачым гэтыя паведамленні: той першы, а гэты — адстае. Прачытаў вынікі, заўважыў сваё прозвішча, сябра, і ўсё. Тэма быццам на гэтым вычарпана. Толькі нашы праблемы застаюцца. Дзе ж яны адлюстроўваюцца?

Першае пытанне. Крос звычайна, як вядома, адбываецца пад лозунгам: «Бегаць! Бегаць! Бегаць!» А навошта? У імя якой мэты бегаць?

У імя... Не, чытач, гэта не красамоўны выраз. Мэта кросу — аздараўленне. А мы часта пра гэта забываем. Крос неяк сам сабой ператвараецца ў мерапрыемства, і не больш таго. А трэба, каб ён быў адным з паказчыкаў фізічнай падрыхтаванасці яго ўдзельнікаў.

Другое пытанне. Не адзін год жыве яно. Нейкім дробязным здаецца на першы погляд: арганізацыя гарачага чаю з булачкай. Перад кросам гэтыя 1500 булачак і чай ёсць (на паперы), а ў час яго правядзення дзе яны? Тонуць у паперах! Дык калі гэта так ужо складана для спартыўнага клуба БДУ — знайсці капеечную булачку і шклянку чаю — студэнты з вялікай ахвотай і самі назбіраюць сабе на чай. А толькі каму здаць грошы? Дзе знайсці арганізатараў...

Нельга ўрэшце не ўспомніць добрым словам тых, хто аднёсся да кросу не як да лішняга мерапрыемства, а як да часткі сваёй работы. Калі ў трэнера баліць душа за сваіх выхаванцаў, вядома, яго старанні дарма не праходзяць. Таму сведчанне, напрыклад, выступленне ў кросе першакурснікаў факультэта журналістыкі пад кіраўніцтвам Людмілы Канстанцінаўны Артамонавай. Дзякуючы нашаму выкладчыку на старт мы выходзілі толькі з аптымістычным настроем. Заслугоўваюць падзякі і іншыя выкладчыкі фізічнага выхавання: У. С. Муратаў (мехмат), А. М. Мехнавец (ФПМ), А. У. Башаркевіч (хімфак), У. С. Фралоў (юрфак).

А. МАЖЭЙ.
студэнт факультэта журналістыкі.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 2 кап.
Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.
10 снежня 1987 г.
Зак. 1598.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

В. а. рэдактара
З. А. АЛЯШКЕВІЧ.